**ВАЎЧОК Ірына Паўлаўна.** Нарадзілася 17 сакавіка 1946 г. у в. Парэчча Пінскага раёна Брэсцкай вобласці ў сям'і служачых. Беларуска. Скончыла педагагічны факультэт Беларускага інстытута фізічнай культуры па спецыяльнасці "Фізічная культура і спорт" з наданнем кваліфікацыі "Выкладчык фізічнай культуры і спорту" (1968). Вучонае званне дацэнта нададзена ў 1996 г. Працавала асістэнтам (1968–1971), старшым выкладчыкам (1971–1997), дацэнтам (1997–2000) кафедры фізвыхавання БрДУ. У 2000–2006 гг. – дацэнт, у 2006–2013 гг. – старшы выкладчык кафедры фізічнай культуры. Аўтар больш за 70 навуковых, навукова-метадычных публікацый.

***Навуковыя інтарэсы:*** праблемы фізкультурна-аздараўленчай работы са студэнтамі, тэорыя і методыка фізвыхавання, спартыўная трэніроўка і аздараўленчая фізічная культура. ***Асноўныя публікацыі:*** Подвижные игры младших школьников : учеб. пособие. Мн., 1987; Фізкультурныя хвілінкі // Пачатк. шк. 1995. № 4; Утренняя гигиеническая гимнастика в режиме дня студентов : метод. рекомендации. Брест, 2002.